Кіраўнік прэзыдэнцкай адміністрацыі абяцае «пазытыўныя крокі» на мэдыйным рынку

Судзьдзя папрасіў прытулку ў Польшчы

Аляксей Кароль атрымаў журналісцкі «Оскар»

Нацбанк забараніў купляць валюту

А. Мілінкевіч: «Перагрус у нашым офісе – сур'ёзная палітычная правакацыя»

Да 10 сьнежня ў Менску прыбяруць каля паўтысячы камэрцыйных кіёскаў


13–15 лістапада адбыўся чарговы XI Менскі форум, які зафіксаваў зрухі ў дачыненьнях Беларусі з ЭЗ. Упершыню ў гэтым мерапрыемстве прыняў удзел кіраўнік адміністрацыі прэзыдэнта, упершыню прадстаўнікі ўладаў абяцалі зрабіць намаганьні для набліжэньня ўнутрыпалітычнай сытуацыі да эўрапейскіх стандартаў. Падчас працы форуму адбылася кароткая «гістарычная» размова, у нефармальнай абстаноўцы, кіраўніка адміністрацыі прэзыдэнта Ўладзімера Макея з экс-кандыдатам у прэзыдэнты ад апазыцыі Аляксандрам Мілінкевічам. Дагэтуль на такім узроўні ўлады з апазыцыяй адкрыта не камунікавалі.

Агульная атмасфэра форуму і падзеі, якія яго суправаджаюць, ствараюць пэўныя перадумовы для разьвіцьця абмежаванага супрацоўніцтва Беларусі з ЭЗ.

«XI Менскі форум адрозьніваецца ад папярэдніх у тым ліку складам і ўзроўнем удзельнікаў і дэманструе новыя, першыя крокі Беларусі і Эўразьвязу, скіраваныя на нармалізацыю адносінаў», – заявіў старшыня Менскага форуму, нямецкі палітоляг Райнэр Лінднэр. Ён таксама лічыць, што Беларусь стала аб’ектам інтэграцыйнай канкурэнцыі з боку ЭЗ і Расеі. Таму сытуацыя, якая складаецца вакол гэтага, як і нядаўні Менскі форум, выклікае вялікую цікавасьць.



photo.bymedia.net

У вітальным звароце міністра замежных спраў Нямеччыны Франка-Вальтэра Штайнмайера да ўдзельнікаў форуму гаворыцца: «Нямеччына, як і ЭЗ, думае пра тое, як прагматычна і апэратыўна ўключыць Беларусь у асобныя галіны Эўрапейскай палітыкі добрасуседзтва — энэргетыкі, транспарту, транзыту». Паказальна, што ніхто так і не ўзгадаў на форуме кіраўніка беларускага МЗС Сяргея Мартынава, які ў гэты час знаходзіўся ў Швайцарыі зь невядомымі для многіх беларускіх

грамадзян мэтамі. Ніводзін СМІ пра факт такой дзіўнай адсутнасьці кіраўніка МЗС у краіне так і не паведаміў. Ня выключана, што рыхтуецца зьмена цяперашняга кіраўніка замежнапалітычнага ведамства Беларусі, якому прадказваюць прызначэньне амбасадарам у Брусэлі.

Агульнае зьмякчэньне ўзаемнай рыторыкі і скіраванасьць на прагматычнае супрацоўніцтва адзначаюць усеназіральнікі і экспэрты. Аднак ацэнкі экспэртаў адрозьніваюцца ў дачыненьні да гатоўнасьці афіцыйнага Менску рухацца ў рэчышчы пяці прыярытэтных кірункаў, вызначаных Брусэлем у якасьці неабходных для разьвіцьця дыялёгу. Гэта адсутнасьць палітзьняволеных, гарантыі свабоды выказваньня думкі ды свабоды СМІ, рэфармаваньне беларускага выбарчага заканадаўства, не пагаршэньне ўмоваў функцыянаваньня няўрадавых арганізацыяў, гарантыі свабоды сходаў.

Беларускі бок у сваю чаргу, мяркуючы па ўсім, найбольш схільны: адмовіцца ад практыкі крымінальных пакараньняў за палітычныя погляды; адхіліць ад вагароў прыняцьця рашэньняў асобаў, датычных да палітычных перасьледаваньняў; правесьці пэўную эканамічную лібэралізацыю; крыху зьмякчыць антызаходнюю рыторыку ў прапагандзе; зрабіць вельмі асьцярожныя крокі ў адносінах свабоды слова і сходаў. Беларусь таксама разьлічвае на пэўную падтрымку ЭЗ ў адносінах некаторай незалежнасьці ад Расеі ў прыняцьці замежнапалітычных рашэньняў.

Беларусь заклікае ЭЗ вызначыцца са статусам пагадненьня пра партнэрства і супрацоўніцтва PCA (Partnership and Cooperation Agreement), якое было падпісана бакамі ў 1995 годзе, але не набыло моц.

Прадстаўнікі ўладаў настойваюць, што інтэрас бакоў да супрацоўніцтва ўзаемны, і гэта выключае выстаўленьне Беларусі патрабаваньняў для працягу дыялёгу.

Варта адзначыць, што Расея таксама гатовая зрабіць пэўныя крокі для нармалізацыі дачыненьняў Беларусі з Эўропай з тым, каб падтрымка Беларусьсю яе замежнапалітычных ініцыятываў стала бы больш важкай. У прыватнасьці, 12 лістапада ў Маскве адбылася сустрэча Генэральнага сакратара Рады Эўропы Тэры Дэвіса зь міністрам замежных справаў Расеі Сяргеем Лаўровым, на якой сярод іншага абмяркоўваліся пэрспэктывы аднаўленьня Беларусі ў ПАРЭ.

Прадстаўнікі афіцыйнага Менску падкрэсьліваюць, што Беларусь не гатовая адмовіцца ад стратэгічнага партнэрства з Расеяй дзеля наладжваньня дачыненьняў з Эўразьвязам. Пра гэта, у прыватнасьці, заявіў удзельнік Менскага форуму, намесьнік начальніка ўпраўленьня замежнапалітычнага аналізу МЗС Беларусі Андрэй Ярошкін.

Важнай падзеяй стала падпісаньне 14 лістапада Расеяй і Беларусьсю пагадненьня пра даваньне Беларусі дзяржаўнага крэдыту. Пры гэтым бакі дамовіліся наконт пераходу Беларусьсю на расейскія рублі ў аплаце расейскіх нафты і газу. З боку ўраду Расеі пагадненьне падпісаў віцэ-прэм'ер, міністар фінансаў Аляксей Кудрын, з боку Беларусі – міністар фінансаў Андрэй Харкавец.

Крэдыт памерам у USD2 млрд. будзе давацца па стаўцы LIBOR+3. Першая транша ў USD1 млрд. ужо паступіла, другая транша ў USD1 млрд. паступіць да 28 лютага 2009 г. Па асноўнай пазыцы Беларусі будзе дадзены льготны пэрыяд на 5 гадоў.

Адзначым, што пагадненьне пра крэдыт пакуль падпісанае толькі на USD1 млрд. Другі мільярд мяркуецца вылучыць пасьля падпісаньня ў лютым пляну сумесных дзеяньняў па каардынацыі мераў па павышэньні канкурэнтаздольнасьці нацыянальных эканомікаў. Магчыма, аплата расейскімі рублямі – не адзіная ўмова расейскага боку. Другой такой умовай, зрэшты, ужо даўняй, зьяўляецца зьняцьце гандлёвых бар'ераў для расейскіх тавараў на беларускім рынку.

Акрамя рашэньня аднаго з найважнейшых пытаньняў расейска-беларускіх дачыненьняў, варта адзначыць яшчэ дзьве падзеі.

Па-першае, гэта датычыцца «адкрыцьця таямніцы» Аляксандрам Лукашэнкам у інтэрвію «The Wall Street Journal» пра тое, што Беларусь вядзе перамовы наконт набыцьця расейскіх ракетных комплексаў «Іскандэр». Паводле афіцыйных паведамленьняў прадстаўнікоў расейскага абароннага комплексу і паводле інфармацыі зь іншых крыніцаў, Расея не намераная да 2011–2015 гг., то бок таго моманту, пакуль «Іскандэры» ня будуць у дастатковай колькасьці пастаўленыя на ўзбраеньне ў расейскую армію, разглядаць гэтыя пляны беларускага боку. Нават згода Беларусі на адзіную сыстэму супрацьпаветранай абароны (СПА) з Расеяй не дапаможа Беларусі рэалізаваць гэтыя пляны. То бок «таямніца» Лукашэнкі – гэта спосаб паказытаць нэрвы Захаду.

Па-другое, 14 лістапада А. Лукашэнка ўхваліў праект Пагадненьня паміж Беларусьсю і Расеяй у якасьці грунту для перамоваў па сумеснай з Расеяй ахове вонкавай мяжы і стварэньні Адзінай рэгіянальнай СПА. На правядзеньне перамоваў і падпісаньне пагадненьня ўпаўнаважаны міністар абароны Беларусі Леанід Мальцаў.

У Менску зь вялікімі надзеямі ўспрынялі пагрозу Пуціна адмовіцца ад газаправоду «Nord Stream». Экспэрты зьвяртаюць увагу на тое, што праект БТС-2 так і не ўхвалены расейскім урадам і, хутчэй за ўсё, будзе адкладзены на нявызначаны тэрмін. Такім чынам, значэньне Беларусі ў расейскіх сыравінных транзытных плынях захоўваецца, што ўмацоўвае яе пазыцыі ў гандлі з Расеяй па коштах на энэрганосьбіты ў прыватнасьці і двухбаковым дыялёгу наагул.

АФІЦЫЙНА

## Кіраўнік прэзыдэнцкай адміністрацыі абяцае «пазытыўныя крокі» на мэдыйным рынку

***Пра гэта Ўладзімер Макей заявіў 13 лістапада на адкрыцьці XI Менскага форуму ў адказ на пытаньне з залі, паведамляе прэсавая служба ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» са спасылкай на «Нашу Ніву» і naviny.by.***

Як паведамляе «Наша Ніва», пасьля вітальнага слова Ул. Макея слова ўзяў першы амбасадар Беларусі ў Нямеччыне Пятро Садоўскі. «Маё пытаньне простае, як тры рублі. Калі мы зможам набываць «Народную волю» ў шапіках?» — запытаўся П. Садоўскі, чым выклікаў апладысмэнты публікі.


photo.bymedia.net

«Макей сумеўся, вытрымаў паўзу і адказаў па-беларуску, што “пазытыўныя крокі будуць абавязкова, і яны будуць датычыць таксама сытуацыі на мэдыйным рынку”», — піша «Наша Ніва».

«Выступаючы 13 лістапада на адкрыцьці XI Менскага форуму, кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта заявіў, што лічыць «унікальным момантам» цяперашнюю магчымасьць Беларусі і Эўропы выраўняць стасункі й далучыць Беларусь да агульнаэўрапейскіх працэсаў, — паведамляе рэсурс naviny.by. — Адказваючы на пытаньні прысутных, ён паабяцаў, што беларускія ўлады зробяць крокі, скіраваныя на ажыцьцяўленьне чаканьняў Эўразьвязу на працягу выпрабавальнага тэрміну да красавіка 2009 году.

ПАЛІТЫКА

## Судзьдзя папрасіў прытулку ў Польшчы

***Былы старшыня Клімавіцкага раённага суду Ігар Цішкін папрасіў палітычнага прытулку ў Польшчы. Свой крок ён патлумачыў ціскам з боку ўладаў Беларусі.***

Паводле яго словаў, ён спрабаваў змагацца зь мясцовымі карупцыянэрамі, якія займаліся кантрабандай сьпірту ў Расею. Цішкін сьцьвярджае, што ў гэтых махінацыях замяшаныя таксама супрацоўнікі спэцслужбаў. Ігар Цішкін працаваў старшынём Клімавіцкага раённага суду з 2000 па 2007 гады. З пасады ён быў вызвалены паводле загаду прэзыдэнта Лукашэнкі летам 2007 году за парушэньні закону. Дарэчы, паводле магілёўскіх прадстаўнікоў апазыцыі, Ігар Цішкін неаднаразова судзіў апанэнтаў улады.

ГРАМАДЗТВА

## Аляксей Кароль атрымаў журналісцкі «Оскар»

***Беларускі журналіст, шэф-рэдактар недзяржаўнай газеты «Новы Час» Аляксей Кароль атрымаў міжнародную ўзнагароду імя Найта ад Міжнароднага цэнтру журналістаў, паведамляе прэсавая служба ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў».***

Цырымонія ўзнагароджаньня адбылася 12 лістапада ў Вашынгтоне. Разам з А. Каралём прэмію атрымалі амэрыканскі журналіст, карэспандэнт «New York Times» Джон Бернс (John Burns) і журналіст з Уганды Фрэнк Ніякіру (Frank Nyakairu).

Прэмія Найта лічыцца надзвычай прэстыжнай. За 10 гадоў існаваньня прэмія набыла статус своеасаблівага «Оскара» для журналістаў. Яе ляўрэатаў вызначае незалежнае журы, у якое ўваходзяць


photo.bymedia.net

прадстаўнікі аўтарытэтных выданьняў і агенцтваў — «New York Times», «Washington Post», ABC, CBS, «Reuters», CNN ды іншых СМІ.

ЭКАНОМІКА

## Нацбанк забараніў купляць валюту

***Нацыянальны банк увёў забарону на набыцьцё валюты на пазабіржавым валютным рынку. Рашэньне датычыць апэрацыяў для ажыцьцяўленьня авансавых плацяжоў па імпарце тавараў і паслуг.***

Цяпер банкі маюць абавязак адмовіць рэзыдэнту ў выпадку яго звароту ў банк па набыцьцё замежнай валюты на пазабіржавым рынку з мэтай правядзеньня авансавага плацяжу за імпарт. Набыцьцё валюты можа быць дазволенае толькі пры наяўнасьці хадайніцтва Рады міністраў Беларусі.

На біржавым валютным рынку захаваўся папярэдні парадак набыцьця замежнай валюты.

АПАЗЫЦЫЯ

## А. Мілінкевіч: «Ператрус у нашым офісе – сур'ёзная палітычная правакацыя»


photo.bymedia.net

***У менскім офісе лідэра аргкамітэту Руху «За Свабоду» Аляксандра Мілінкевіча ўвечары 18 лістапада праводзілася «апісаньне маёмасьці», а фактычна ператрус. Палітык называе гэтую акцыю правакацыяй «сілавога» кляну ва ўладзе, піша «Эўрарадыё».***

Паводле словаў Мілінкевіча, у кватэру прыйшлі судовыя выканаўцы, якія пачалі апісваць маёмасьць, што там знаходзілася. Падставай для гэтага нібыта было тое, што 10 гадоў таму ў кватэры быў прапісаны чалавек, супраць якога заведзеная крымінальная справа. Насамрэч жа апісваецца маёмасьць апазыцыянэраў.

«Я лічу, што гэта сур'ёзная палітычная правакацыя. І перш за ўсё тых людзей, якія ня хочуць, каб адносіны Беларусі з Эўразьвязам, Злучанымі Штатамі, дэмакратычным сьветам паляпшаліся. Гэтыя людзі ня хочуць крокаў па лібэралізацыі жыцьця на Беларусі».

ТЭНДЭНЦЫІ

## Да 10 сьнежня ў Менску прыбяруць каля паўтысячы камэрцыйных кіёскаў

***Узамен сталічныя ўлады прапануюць менчукам купляць цыгарэты ў «Белсаюздруку».***

Да канца зімы Менгарвыканкам плянуе прыбраць кіёскі дарэшты. Зараз іх актыўна прыбіраюць у Кастрычніцкім раёне сталіцы. Кіёскі выклалі на вокны загады, якія атрымалі ад адміністрацыі: прыбраца да 10 сьнежня.

«Кіёскі будуць замененыя навесамі. У горадзе наагул кіёскаў ня будзе, апроч "Белсаюздруку"», – «усьцешылі» «Эўрарадыё» ў аддзеле гандлю і паслугаў Адміністрацыі Кастрычніцкага раёну.

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

polska pomoc

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.